Ігнатовіч П.Р.,
канд.гіст.навук,
дацэнт

## ПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ ВА ЎДАСКАНАЛЕННІ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ КУЛЬТУРЫ

Практыка вышэйшых навучальных устаноў і праведзеныя шматлікія даследаванні сацыёлагаў паказваюць, што ў комплексе мер, накіраваных на ўдасканаленне падрыхтоўкі спецыялістаў, вялікае значэнне маюць міжпрадметныя (міждысцыплінарныя) сувязі. Гэта праблема набывае яшчэ больш значную ролю ва умовах універсітэцкай адукацыі, тым больш пры пераходзе да шматузроўневай сістэмы вышэйшай адукацыі. Адсюль і актуальнасць пытанняў, разглядаемых на нашай канферэнцыі.

Вучэбныя дысцыпліны ў комплексе адлюстроўваюць узаемасувязь і субардынацыю вызначанай сукупнасці навуковых дысцыплін з безумоўным улікам профілю ВНУ, факультэта. А паколькі вучэбныя прадметы ці дысцыпліны будуюцца на логіцы той ці іншай навукі, пастолькі яны не могуць быць ізаляваны адзін ад аднаго. Навуковыя даследаванні, асабліва комплексныя, праводзяцца з шырокім выкарыстаннем канцэптуальнага і інструментальнага апарату замежных навук. Комплексны падыход да падрыхтоўкі і выхавання спецыялістаў патрабуе ўзгодненасці ўплыву ўсіх педагогаў на фарміраванне сістэмы навуковых ведаў, поглядаў, перакананняў, паводзін і практычную дзейнасць студэнтаў.

Адсюль некаторыя метадалагічныя пасылкі.

1. Праблема вывучэння і здзяйснення міжпрадметных сувязей можа ставіцца і вырашацца толькі як комплексная праблема і па сваіх мэтавых установках, і па прадмету даследавання, і па сваіх тэарэтычных і практычных рэкамендацыях.

2. Рашэнне гэтай праблемы ўтрымлівае ў сабе значны патэнцыял аптымізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу.

3. Вывучэнне, аптымізацыя і рэалізацыя сувязей павінны апірацца на ўсе звёны вучэбна-выхаваўчага працэсу, г.зн. і лекцыі, і семінары, і сістэму навукова-даследчай і вучэбна-даследчай работы студэнтаў, і вытворчую практыку.

Улічваючы комплексны характар і важнасць праблемы, накоплены вопыт у ВНУ, можна зрабіць вывад, што рэалізацыю міжпрадметнага падыходу ў рамках універсітэта культуры патрэбна весці адначасова па некалькіх накірунках. Гэта:

- пераемнасць міжпрадметнага падыходу ў ВНУ з улікам вопыту ў гэтым накірунку ў школе ці сярэдняй спецыяльнай навучальнай установе;
- раскрыццё ўзаемасувязей паміж дысцыплінамі, спецкурсамі адной і той жа кафедры;
- вызначэнне сувязей паміж дысцыплінамі (прадметамі) дадага цыкла;
- раскрыццё сувязей паміж метадамі выкладання сумежных дысцыплін;
- устанаўленне сувязей паміж спосабамі вучэбнай дзейнасці студэнтаў;
- устанаўленне сувязей паміж методыкамі пазааўдыторнай работы.

Кулажанка Н.С.,
выкладчык

## ЭКАНАМІЧНЫ ПАДЫХОД ДА ВЫЗНАЧЭННЯ ПРЫЯРЫТЭТНЫХ НАПРАМКАЎ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ КУЛЬТУРЫ

Культура як найважнейшы бок жыцця чалавецтва цесна звязана з эканамічным станам грамадства. Дзейнасць у сферы культуры набывае рысы эканамічнай дзейнасці настолькі, наколькі ўплятаецца ў сістэму стварэння аб'ектыўных умоў жыцця асобы і грамадства. Гэта з аднаго боку.

З другога, развіццё сферы культуры ва ўсіх яе формах у канкрэтным грамадстве ў многім залежыць не толькі ад духоўнага, інтэлектуальнага патэнцыялу грамадства, але і ад матэрыяльнага яе забеспячэння, ад выкарыстання пэўных крыніц фінансавання, метадаў і форм арганізацыі і кіравання дзейнасцю ў гэтай сферы.

Стварэнне рыначнай эканомікі характарызуецца адмаўленнем ад каманднa-адміністрацыйнай сістэмы кіравання, ад манапалізму дзяржавы. У сферы культуры гэта выклікае шэраг праблем. Па-першае, знікае асноўная крыніца фінансавання ўсіх устаноў і відаў культурнай дзейнасці, хаця яна была і мізэрная, але ж



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ